На ахматовском балконе, который имеет особенно красивое дизайнерское решение, часто проходят поэтические вечера (здесь же лежат VR-очки). Есть и свой кинозал с большим экраном. Раз в месяц под руководством кинокритика здесь смотрят фильмы молодых режиссеров. Профессионально оборудована студия звукозаписи. За плату здесь любой желающий может записать песню, стихотворение, просто текст. Эта услуга пользуется популярностью. Есть небольшой бизнес-зал, который сдают в аренду. Также из платных услуг – детские кружки и лагеря. Все заработанные деньги в библиотеке тратят на свое дальнейшее развитие. В цокольном этаже расположена своя типография. Молодые дизайнеры, недавние выпускники Академии искусств, разрабатывают веселые наклейки, стикеры, таблички, помогающие ориентироваться в библиотеке. Любой желающий может заказать здесь дизайн-макет своей книги.

Директору *SMART-библиотеки* Анатолию Бабичу всего 31 год. В свое время он получил библиотечное образование, отработал, потом попробовал свои силы в коммерции и вновь вернулся в сферу библиотек. Спустя всего три года работы он занял пост руководителя. Его горящие глаза, энергия еще больше заряжают это место. Кстати, у наших соседей не обязательно иметь библиотечное образование, чтобы занять какую-то должность, достаточно опыта – среди сотрудников много педагогов и психологов.

Подытожив, можно сказать, что современная библиотека – это центр притяжения культурных людей, не меньше. Сюда хочется не просто приходить за книгами, но и возвращаться как можно чаще.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Литвинко, Н.** Библиотека как центр притяжения. Опыт московских коллег [Электронный ресурс] / Нина Литвинко // Национальная библиотека Беларуси : интернет-портал. – 2006–2023. – Режим доступа: https://www.nlb.by/content/news/national-library-of-belarus/biblioteka-kak-tsentr-prityazheniya-opyt-moskovskikh-kolleg/. – Дата доступа: 26.09.2023.

Summary

The article provides an overview of the must visit libraries in Moscow according to young employees of the National Library of Belarus.



**Алена Брыцкая**



**Бібліятэкар Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева**

# БІБЛІЯТЭКА ІМЯ І. КАЛАДЗЕЕВА: 15 ГАДОЎ З ДНЯ ПРЫСВАЕННЯ

*Жыццё Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева багатае на значныя падзеі, кожная з якіх не проста папаўняе бібліяархіў, але і становіцца гісторыка-культурным эксклюзівам у «скарбонцы» падзей і дат нашай культурнай установы. У сярэдзіне ліпеня 2023 г. споўнілася 15 гадоў з таго памятнага дня, калі бібліятэцы прысвоілі імя Івана Каладзеева.*

Ініцыятыву калектыву бібліятэкі і грамадскасці рэгіёна аб прысваенні бібліятэцы Барысава імя Івана Каладзеева падтрымаў Барысаўскі райвыканкам і хадайнічаў аб гэтым перад Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. Так, рашэннем Мінаблвыканкама ад 18 ліпеня 2008 г. Цэнтральнай бібліятэцы Барысаўскага раёна было прысвоена імя І.Х. Каладзеева.

Значная падзея ў гісторыі нашай бібліятэкі адбылася 7 верасня 2008 г. У гэты дзень якраз у Барысаве адзначалася вялікае рэспубліканскае свята – Дзень беларускага пісьменства. У ліку яркіх момантаў святкавання запомніўся той, калі на будынку цэнтральнай бібліятэкі з'явілася мемарыяльная імянная дошка Каладзеева (скульптар –




ураджэнец г. Барысава, член Беларускага саюза мастакоў Аляксандр Шомаў).

Бацька Івана Хрысанфавіча Каладзеева (1859–1914) – Хрысанф Іванавіч – патомны дваранін Чарнігаўскай губерні, баявы генерал-палкоўнік, які ўдзельнічаў у Крымскай кампаніі 1853–1856 гг. Ва ўзнагароду за руплівую службу імператар Аляксандр II аддаў яму ў патомнае валоданне зямлю на паўднёвы ўсход ад Барысава вакол вёсак Чырвонае і Упірэвічы. З таго часу сямейства Хрысанфа Каладзеева (жонка Наталля Якаўлеўна і сын Іван) сталі нашымі землякамі. Каладзееў-малодшы выхоўваўся ў лепшых дваранскіх традыцыях: энцыклапедычная адукаванасць спалучалася ў ім з рэдкім прадпрымальніцкім пачаткам. Усё сваё жыццё ён будаваў і ахвяраваў на карысць Барысава. У XXI ст. гісторыя г. Барысава немагчыма без імя Івана Каладзеева – гісторыка, кнігалюба, калекцыянера, рупліўца і выбітнага знаўца гісторыі вайны 1812 г., а таксама (і гэта немалаважна!) камергера Высокага Двара, памешчыка і землеўладальніка, мецэната і грамадскага дзеяча.

Падзеі на р. Бярэзіне пад Барысавам, якія адбыліся ў 1812 г. і сталі трагічнымі для Напалеона, прагрымелі на ўсю Еўропу памінальным набатам французскай арміі. Увагу замежных даследчыкаў, гісторыкаў, бібліяфілаў і аматараў даўніны прыцягнуў таксама «Нова-Барысаўскі збор кніг, рукапісаў, гравюр, планаў і карт памешчыка Мінскай губерні І.Х. Каладзеева», якім спачатку, на мяжы XIX–XX стст., зацікавіліся расійскія даследчыкі эпохі напалеонаўскіх войн. З адначасовым належным вядзеннем гаспадаркі гэтую велізарную працу скрупулёзна і старанна Каладзееў сабраў да 1904 г. – больш за пяць тысяч назваў, якія складалі ў агульнай сукупнасці каля 15 тыс. тамоў. Гэта была найбагацейшая, ні з чым не параўнальная бібліятэка пра 1812 г.!

У 1913 г. (прыкладна за год да заўчаснага скону) Іван Хрысанфавіч частку збору бязвыплатна перадаў у Маскву, дзе планавалася адкрыць музей вайны з Напалеонам. А ў 1915 г., выконваючы волю нябожчыка мужа, удава Вольга Сяргееўна перадала туды ж другую частку. Так у Маскве «аселі» звыш 14 рукапісаў і ізаматэрыялаў, даведачная літаратура і асабісты архіў Каладзеева. Пасля падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі збор «Бібліятэка І.Х. Каладзеева» паступіў у Дзяржаўны гістарычны музей г. Масквы. Нешта захоўваецца там і сёння, нешта адышло ў фонды расійскіх бібліятэк. У 1926 г. па патрабаванні ўрада БССР восем тысяч кніг з калекцыі барысаўскага збіральніка вярнулася ў Дзяржаўную бібліятэку імя У.І. Леніна.

У Барысаў, на вялікі жаль, не вярнулася нічога. Таму супрацоўнікі Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева паставілі сабе за мэту паўтарыць справу знакамітага земляка: стварыць свой бібліятэчны збор дакументаў па эпосе напалеонаўскіх войнаў. Пры гэтым асаблівую ўвагу звярнуць на падзеі вайны 1812 г. на Барысаўшчыне. Так у жаданні ўвекавечыць памяць дастойнага сына сваёй зямлі Івана Каладзеева злучыліся бібліятэчная справа і краязнаўства. У выніку – маецца на ўвазе, да лета 2008 г. – быў сабраны разнастайны па відах і тыпах фонд, у якім суседнічалі і рарытэтныя выданні і прадметы археалагічных

пошукаў на гістарычных месцах бітваў 1812 г. на Бярэзіне. Разам з тым быў пакладзены пачатак стварэнню карціннай галерэі копій работ мастакоў аб Барысаўскай бітве і Бярэзінскай пераправе, рыхтаваўся мемарыяльны куток І.Х. Каладзеева.

На працягу наступных 15 год для захавання памяці Івана Хрысанфавіча Каладзеева ажыццяўлялася многае. Мемарыяльны куток І.Х. Каладзеева стаў асновай для Мемарыяльна-выставачнай залы І.Х. Каладзеева і гісторыі Вайны 1812 года. Ён адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў на чацвёртым паверсе цэнтральнай бібліятэкі 25 лістапада 2017 г.

У зале экспануюцца копіі архіўных матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці Івана Каладзеева, гісторыі яго роду і сям'і яго жонкі Вольгі Сяргееўны. Прадстаўлены планы, карты, дакументы і прадметы матэрыяльнай культуры, якія раскрываюць гісторыю пасада Нова-Барысаў перыяду жыцця сям'і Каладзеевых (апошняя чвэрць XIX – пачатак XX ст.).

За гады савецкай улады пахаванне Каладзеева было страчана. У лістападзе 2012 г. на адкрыцці IV «Каладзееўскіх чытанняў» Барысаўскаму благачыннню ўрачыста перадалі мемарыяльную дошку-картуш у памяць Івана Хрысанфавіча Каладзеева. А 20 мая 2014 г. – у мемарыяльныя дні 100-годдзя яго смерці – у Богаяўленскай капліцы храма Святой Жываначальнай Тройцы адбылося адкрыццё дошкі-кенатафа і здзейснена паніхіда, якую ўзначаліў благачынны Барысаўскай царкоўнай акругі протаіерэй Аляксандр Вярбіла.

Пра падзеі вайны 1812 г. на Барысаўшчыне расказваюць рэканструяваныя элементы ўніформы і амуніцыі воінаў Расійскай імператарскай арміі, а таксама знаходкі, выяўленыя на месцах былых бітваў, сувенірныя вырабы. Асобны раздзел прысвечаны дзейнасці барысаўскіх клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі па эпосе напалеонаўскіх войн. Тут прыгожыя фрагменты свецкіх жаночых убораў і экіпіроўкі воінаў абедзвюх армій уласнаручна зроблены мастаком бібліятэкі Андрэем Мірзаянам. Адметнай асаблівасцю экспазіцыі з'яўляецца магчымасць наведвальнікаў патрымаць экспанаты ў руках, прымерыць элементы ўніформы і зрабіць здымкі на памяць. Так бы мовіць, паспрабаваць на сабе і адчуць дакрананне даўно мінулых дзён.

Значную частку мемарыяльнай экспазіцыі займае «Новы барысаўскі збор матэрыялаў па эпосе напалеонаўскіх войн і вайне 1812 года», сабраны па падабенстве знакамітай калекцыі Івана Каладзеева. Збор налічвае каля 2000 выданняў, у тым ліку рарытэтных і рэдкіх экзэмпляраў. А ў сярэдзіне верасня 2020 г., у дзень прафесійнага свята бібліятэкараў Беларусі, у прасторы Мемарыяльна-выставачнай залы І.Х. Каладзеева і гісторыі вайны 1812 года адбылася ўрачыстая прэзентацыя аўтарскага экслібрыса для «Новага барысаўскага збору матэрыялаў па эпосе напалеонаўскіх войн і Вайне 1812 года», выкананага мастаком Андрэем Мірзаянам. Аўтарскі кніжны знак перададзены на вечнае захоўванне ў бібліятэку.

Час лічбавых тэхналогій дазволіў пачаць працу над віртуальным музеем Івана Хрысанфавіча Каладзеева на сайце бібліятэкі.

Як ужо адзначалася, у 2008 г. бібліятэка Барысава атрымала імя Івана Каладзеева. Праз год пад патранатам Барысаўскага райвыканкама яна арганізавала першыя «Каладзееўскія чытанні». Кожны наступны форум насіў сваю пэўную тэматыку. 20 лістапада 2022 г. у Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Х. Каладзеева адбылася ўжо VIII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Каладзееўскія чытанні», прысвечаная 210-й гадавіне падзей вайны 1812 г.

Бібліятэка Каладзеева як сапраўдная захавальніца прац і збораў Івана Хрысанфавіча, гістарычнай памяці аб падзеях вайны 1812 г. на тэрыторыі Барысаўскага рэгіёна будзе далей рухацца ў гэтым кірунку. Новыя адкрыцці, знаёмствы, знаходкі, імёны – усё гэта чакаецца з натхненнем на далейшую плённую працу, на карысць нашых чытачоў, у памяць аб вядомай барысаўскай асобе.

Summary

The article presents the activities of the Borisov Central Regional Library named after I.Kh. Kolodeev on preserving the historical memory of the famous belarusian bibliophile and local historian Ivan Kolodeev.

«Бібліятэчны свет», 2023, № 5 (134). Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1223. Падпісана да друку 12.10.2023. Фармат 60х84 1/8. Гарнітура «Helios». Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 3,72. Тыраж 425 экз. Заказ 1229. Кошт свабодны.
Выдавец і паліграфічнае выкананне: дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».
ЛП № 02330/182 ад 30.07.2009.
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
© «Бібліятэчны свет», 2023